ПЛАЦДАРМ
Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда»
і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь
Выпуск № 12 (63)



■ Нашы дзеці


Фота БЕЛТА.

По традыцыі ў перадсвяточныя дні **міністр абароны генерал-лейтэнант Андрэй РАЎКОЎ** асабіста павіншаваў выхаванцаў Андрэеўскага дзіцячага дома з Новым годам і Калядамі і ўручыў ім падарункі.

Падарункі ад ваеннага ведамства выхаванцы дзіцячага дома атрымліваюць не толькі напярэдадні свят. Дзякуючы матэрыяльнай дапамозе Міністэрства абароны дзяржаўная сацыяльна-педагагічная ўстанова штогод становіцца больш камфортнай і ўтульнай — сапраўдным домам для дзяцей. Толькі сёлета на спонсарскія сродкі ведамства ажыццёўлены рамонт кухоннага блоку сталовай, дзе ўстанавілі новае абсталяванне. Закуплены і выкарыстоўваюцца па прызначэнні 11 спартыўных трэнажораў.

■ Профі

# УЧОРА — ЮНАК, А СЁННЯ — ДЭСАНТНІК!

## Карэспандэнту «Звязды», які папоўніў шэрагі эліты Узброеных Сіл, расказалі пра асаблівасці паветрана-дэсантнай службы

**Няма такога чалавека, які б не ведаў пра славу «блакітных берэтаў». Воіны-дэсантнікі — заўсёды на вастрыні атакі, яны гатовы адправіцца ў любы пункт свету і выканаць пастаўленую задачу. Сапраўднае баявое братэрства, дзе маладыя людзі штодня правяраюць на трываласць сваю адвагу, сілу і майстэрства. Менавіта ў такім рэжыме праходзіць кожны дзень салдата тэрміновай службы ў 103-й гвардзейскай асобнай паветрана-дэсантнай брыгадзе, якая дыслакуецца ў Віцебску.**

Пра гэта я ведаю не па чутках, бо ўсе выпрабаванні ў гэтыя дні праходжу асабіста. Ужо паспеў прызвычаіцца да распарадку дня і фізічных нагрузак. Вядома, яны далёкія ад тых, што адчуваюць вайскоўцы разведвальных падраздзяленняў брыгады, якія ў поўнай экіпіроўцы прабягаюць па 20 кіламетраў. Але чалавек, які здольны рухаць горы, пачынае з маленькіх камянёў.



У гэтым мне і многім іншым хлопцам, хто служыць у 103-й брыгадзе, дапамагае **начальнік штаба — першы намеснік камандзіра батальёна новага папаўнення гвардыі падпалкоўнік Дзмітрый КШЫСІНСКІ.** Менавіта пад яго кіраўніцтвам учарашнія юнакі становяцца бясстрашнымі байцамі, якія здольныя атакаваць любога ворага, што пасягне на суверэнітэт нашай краіны. Нягледзячы на шчыльны графік, ён знайшоў час, каб расказаць аб тым, як жывуць навабранцы нябеснага войска.

***— Вайсковае злучэнне мае багатую гісторыю даўжынёй больш чым у 70 гадоў. Як змянілася дывізія за перыяд суверэнітэту Беларусі?***

— Ва ўсе часы асабовы склад злучэння выконваў задачы з гонарам і мужнасцю. На працягу свайго існавання злучэнне кавала сапраўдных мужчын. Гэтыя традыцыі жывуць і дагэтуль. 103-я паветрана-дэсантная брыгада ўдзельнічае практычна ва ўсіх вучэннях Узброеных Сіл: як на тэрыторыі Беларусі, так і за яе межамі. Стабільна высокія вынікі злучэння не раз былі адзначаны Прэзідэнтам краіны і камандаваннем Узброеных Сіл. Наведваючы брыгаду ў 2013 годзе, кіраўнік дзяржавы высока ацаніў сацыяльна-бытавыя ўмовы размяшчэння вайскоўцаў, узровень правядзення заняткаў па баявой падрыхтоўцы. Мы пастаянна ўдасканальваем сваю вывучку і майстэрства, а таксама матэрыяльна-тэхнічную базу.

***— Якім крытэрыям павінны адпавядаць будучыя дэсантнікі, каб патрапіць служыць у 103-ю брыгаду?***

— Каб быць прызваным на ваенную службу ў Сілы спецыяльных аперацый, неабходна мець самую высокую групу прыдатнасці па здароўі, адпаведны ўзровень нервова-псіхічнай устойлівасці і эмацыйнай стабільнасці, а таксама выдатную фізічную падрыхтоўку. У нашых шэрагах — толькі лепшыя. І гэта цалкам відавочна, бо брыгада з'яўляецца элітай Узброеных Сіл краіны. Сёння ўсім вядома, што блакітны берэт і цяльняшка — сімвалы мужнасці, адвагі і гонару. Для любога мужчыны пачэсна насіць іх. Таму многія прызыўнікі просяцца менавіта да нас. Але акрамя ўсяго пералічанага, важным фактарам для службы ў брыгадзе з'яўляецца адсутнасць боязі вышыні, з якой не кожны можа справіцца.

***— Што чакае новае папаўненне ў бліжэйшы час?***

— Тыя, каму пашчасціла трапіць сюды на пачатковым этапе, праходзяць псіхалагічныя даследаванні асобы. Праводзяцца розныя тэсты, дзякуючы якім вызначаецца ўзровень інтэлектуальнага развіцця вайскоўцаў. Увесь час пад наглядам знаходзіцца ступень прыдатнасці здароўя. На пачатковым этапе таксама мае значэнне, каб малады чалавек адаптаваўся да новага калектыву. Але ёсць і тыя вайскоўцы, якія цяжэй пераносяць фізічныя нагрузкі інтэнсіўнай баявой падрыхтоўкі. І галоўнае цяпер для адміністрацыі батальёна новага папаўнення — дапамагчы ў адаптацыі і як роўных паставіць усіх у адзін шэраг. Таксама наш метад адбору дазваляе выявіць тых вайскоўцаў, якія могуць заняць пасады малодшага камандзірскага складу. Некаторыя ўжо праз тры месяцы стануць малодшымі сяржантамі, а найбольш падрыхтаваныя і адказныя — камандзірамі аддзяленняў. Як паказвае практыка, яны абавязкова будуць дапамагаць сваім менш дасведчаным таварышам.

***— Адзін з самых складаных момантаў для кожнага дэсантніка — яго першы парашутны скачок...***

— Здзяйсненне вайскоўцамі першага парашутнага скачка — і ёсць адна з галоўных задач агульнавайсковай падрыхтоўкі, якую нам трэба будзе асвоіць. Адпаведныя мерапрыемствы адбудуцца на базе злучэння з выкарыстаннем паветрана-дэсантнага комплексу і вучэбна-матэрыяльнай базы. У працэсе падрыхтоўкі да парашутнага скачка мы ўдасканальваем будучага дэсантніка як фізічна, так і маральна. Але ваеннаслужачаму недастаткова ўсяго толькі здзейсніць парашутны скачок. Ён павінен умець весці агонь па праціўніку ў паветры, пазбягаць няштатных сітуацый, прызямляцца на розныя перашкоды. А самае галоўнае — пасля прызямлення ў складзе падраздзялення выканаць пастаўленую задачу.

***— Ці адбудзецца дэсантаванне асабістага складу батальёна падчас зімы?***

— З гэтай мэтай на скачкі будуць адведзены два дні. Калі нябесная канцылярыя дазволіць, то ўсё адбудзецца да Новага года. Што тычыцца псіхалагічнай падрыхтоўкі да гэтага моманту, то мы зробім усё, што ад нас залежыць. Нельга не адзначыць той факт, што асабовы склад навабранцаў гэтага прызыву хутка і паспяхова асвойвае вучэбную праграму. Назіраецца станоўчая дынаміка і ў іх патрыятычным выхаванні. Упэўнены, што яны справяцца з пастаўленымі задачамі і размяркуюцца па падраздзяленнях.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■ Тонкасці прафесіі

# Выявіць нябачнага ворага

## Могуць прадстаўнікі войск радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны

**Калі амаль стагоддзе таму ствараліся войскі радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны, ніхто нават падумаць не мог, што такі від абароны будзе надзвычай актуальны ў XXI стагоддзі. Прычым не толькі ў ваенны, а, як паказала чарнобыльская трагедыя, і ў мірны час.**

Сёння, каб знішчыць чалавека або нават цэлы горад, няма неабходнасці націскаць на курок або прыводзіць у боегатоўнасць сістэму залпавага агню. Каб абараніць насельніцтва ад зброі масавага паражэння — радыяцыі, ядавітых рэчываў і вірусаў — руку на пульсе трымаюць спецыялісты войск радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны.

Пабываўшы ў 106-м разліковааналітычным цэнтры гэтых войск, карэспандэнты «Звязды» даведаліся, якім чынам прадухіляецца нябачная для звычайнага чалавека небяспека.

### НА КАНТРОЛІ

У 106-м разліковa-аналітычным цэнтры служаць выпускнікі ваеннага факультэта БДУ, Ваеннай акадэміі радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны імя маршала Цімашэнкі, што ў Кастраме. Вышэйшая адукацыя — мінімум, што патрэбна для таго, каб заступіць на кругласутачнае дзяжурства.

Цэнтр прызначаны для ажыццяўлення збору, апрацоўкі, аналізу інфармацыі аб радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абстаноўцы ў сістэме выяўлення ацэнкі маштабаў і наступстваў аварый на небяспечных аб'ектах, прымянення праціўнікам зброі масавага паражэння.

— Акрамя маніторынгу РХБ абстаноўкі на тэрыторыі Беларусі і паблізу яе межаў, спецыялістамі цэнтра ажыццяўляецца збор даных аб радыяцыйным, хімічным і біялагічным становішчы за мяжой, — удакладняе **начальнік 106-га разліковa-аналітычнага цэнтра войск радыяцыйнай, хімічнай і біялагічнай абароны падпалкоўнік Сяргей КУЗНЯЦОЎ.** — Змены РХБ абстаноўкі, якія адбываліся ў апошні час, — распаўсюджванне ліхаманкі Эбала на афрыканскім кантыненце, падзеі на тэрыторыі Украіны, прымяненне баевікамі на тэрыторыі Сірыі і Ірака хімічнай зброі, успышкі сібірскай язвы, зафіксаваныя ў Расійскай Федэрацыі, — былі на асаблівым кантролі.


Адбор і ідэнтыфікацыя біялагічных агентаў.

### ЭКАЛОГІЯ — У ПРЫЯРЫТЭЦЕ

Задачы ў галіне аховы навакольнага асяроддзя рэалізуюцца і ва Узброеных Сілах. Не выпадкова ў цэнтры створаны аддзел экалогіі і радыяцыйнай бяспекі. Асабовы склад на базе рухомай лабараторыі радыяцыйнага і экалагічнага кантролю забяспечаны прыборамі радыяцыйнай разведкі і кантролю, хімічнай і біялагічнай разведкі. Калі на тэрыторыі воінскай часці адбываецца здарэнне з удзелам радыяцыйнага, хімічнага або біялагічнага складніка, загадчык лабараторыі выязджае са спецыялістамі на месца, дзе праводзіць аналіз, адбор пробаў, пасля чаго адпраўляе ў адпаведныя санітарна-эпідэміялагічныя цэнтры або лабараторыі. Пры неабходнасці праводзіць дэзынфекцыю або дэзактывацыю. Дарэчы, прыборы, якія вызначаюць радыяцыю, у асноўным беларускай вытворчасці. Яны добра сябе зарэкамендавалі ў пошуку і выяўленні небяспечных зон.

### РАДЫЯЦЫЙНАЯ БЯСПЕКА

Спецыялісты 106-га разліковa-аналітычнага цэнтра актыўна ўзаемадзейнічаюць з Рэспубліканскім цэнтрам кіравання і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі МНС, а таксама з Рэспубліканскім цэнтрам па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Аб'ядная сістэма радыяцыйнага маніторынгу забяспечвае перадачу інфармацыі аб дзвюх спыненых каля нашых межаў атамных электрастанцыях (Чарнобыльскай і Ігналінскай) і дзейнічаючых (Смаленскай і Ровенскай). Адпаведныя датчыкі, якія знаходзяцца на тэрыторыі нашай краіны, у рэжыме рэальнага часу адсочваюць абстаноўку. Калі будзе назірацца перамяшчэнне радыеактыўных элементаў у бок ваенных аб'ектаў, ваеннаслужачыя павінны прадугледзець апавяшчэнне аб абароне асабовага складу і насельніцтва, якое знаходзіцца ў раёнах размяшчэння вайсковых часцей.

— Ні адна з заглушаных атамных станцый на дадзены момант ніякай пагрозы не нясе, — гаворыць Сяргей Кузняцоў. — Небяспеку ўяўляюць толькі тыя тэрыторыі, якія, згодна з пастановай Савета Міністраў, з'яўляюцца забруджанымі. Як вядома, гэтыя тэрыторыі аднесены да зон адчужэння і знаходзяцца на кантролі ў дзяржавы.

Ужо вядзецца збор і апрацоўка даных па Беларускай атамнай электрастанцыі. Дзякуючы спецыяльным датчыкам вайсковыя часці будуць забяспечаны інфармацыяй аб радыяцыйным фоне каля сваіх межаў. А гэта значыць, што бяспека краіны — пад кантролем.

**Вераніка КАНЮТА.**

■ Абеліскі параненай зямлі

# СУСТРЭЧА ПРАЗ

## Сваякі вязняў канцлагера «Шталаг 382» пераадолелі тысячы кіламетраў, каб пакланіцца беларускай зямлі, якая назаўжды прытуліла іх продкаў

**У верасні на тэрыторыі вайсковай часці, што ў Барысаве, разгарнуліся раскопкі. Салдаты, якія падчас будаўнічых работ выпадкова натрапілі на чалавечыя астанкі, нават падумаць не маглі, што маюць справу з масавым пахаваннем часоў Другой сусветнай вайны...**

Дзякуючы архівам высветлілася, што ў гады Вялікай Айчыннай на гэтым месцы знаходзіўся нямецкі лагер для савецкіх ваеннапалонных. «Шталаг 382» дзейнічаў з 1941 па 1943 год. Згодна з Актам надзвычайнай камісіі, які быў складзены ў верасні 1944 года, пасля вызвалення Барысава на тэрыторыі лагера было знішчана і пахавана звыш 9 тысяч ваеннаслужачых Чырвонай Арміі. У некаторых крыніцах ёсць звесткі пра тое, што ў 1943 годзе тут таксама ўтрымліваліся ўдзельнікі супраціўлення.

За паўгода вайскоўцы 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Міністэрства абароны паднялі з зямлі астанкі 4340 загінулых ваен-

